# Студэнты ля паходнага кастра

◄◄◄ 1 стар.

14 каманд — прадстаўніц устаноў вышэйшай адукацыі з усёй краіны — прыехалі на злёт. Больш за 200 студэнтаў адклалі ўбок падручнікі, каб адчуць яднанне з прыродай і сустрэцца з сябрамі ля паходнага кастра.

Рэспубліканскі турысцкі злёт — гэта не толькі адпачынак на свежым паветры, але і спаборніцтвы, якія складаюцца са спартыўнай і конкурснай частак. Спартыўная частка спаборніцтваў — гэта доўгая і кароткая дыстанцыі, якія неабходна прайсці ўдзельнікам. Доўгая дыстанцыя цікавая, дынамічная і складаная. 6 кіламетраў юнакам і дзяўчатам трэба прабегчы па лесе, арыентуючыся па карце і пераадольваючы перашкоды на этапах. Ім неабходна пераправіцца праз раку па бервяне, арганізаваўшы страхавачныя поручні, пераадолець яр па паралельных вяровачных поручнях, узняцца і спусціцца па схіле, знайсці стаўленне каманд — паказаў, што ўсе студэнты настроены на перамогу. Выступалі ўдзельнікі на спецыяльна пабудаванай для злёту сцэне. Лепшым журы палічыла прадстаўленне каманды Акадэміі МУС.

Найважнейшая частка спаборніцтваў — конкурс турысцкіх навыкаў і быту. На злёце лічыцца, што тэрыторыя лагера каманды — гэта працяг корную чысціню і парадак у сваіх лагерах і нават праяўляюць фантазію ў іх афармленні. Першае месца ў конкурсе турысцкіх навыкаў і быту падзялілі паміж сабой каманды Акадэміі МУС і Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

"Будні злёту" — так называліся насценгазеты, якія стваралі каманды. І гэта яшчэ адзін конкурс. Газеты хоць і мелі агульную назву, але кожная была па-свойму цікавая.





І які ж паход без песні ля кастра? Конкурс турысцкай песні стаў рамантычным акордам злёту. І тут складана было пачуць традыцыйныя турысцкія песні, студэнты выконвалі шмат патрыятычных і аўтарскіх песень. Напрыклад, Алена Парфянюк з Брэсцкага дзяржаў-



і перанесці "пацярпелага" таварыша. Многім удзельнікам асабліва запомніцца пераправа праз балота, дзе давялося па-сапраўднаму паскакаць па купінах і намачыць ногі. Самымі хуткімі і ўмелымі на доўгай дыстанцыі былі ўдзельнікі каманды Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Кароткая дыстанцыя вельмі відовішчная. Яна арганізавана непасрэдна ў лагеры, і ўдзельнікі, быццам на стадыёне, могуць назіраць за тым, як сапернікі і сябры пераадольваюць перашкоды. На кароткай дыстанцыі сканцэнтраваны заданні на розныя віды тэхнікі спартыўнага турызму. Лепш за ўсіх з гэтымі заданнямі справілася каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры.

Наогул, спартыўная частка стала няпростым заданнем для ўдзельнікаў турзлёту. "Дыстанцыі складаныя, і гэта цудоўна! — дзеліцца ўражаннямі Дар'я Кананові́ч, студэнтка Акадэміі МУС. — Я займаюся турызмам з 8 гадоў, наша зборная каманда акадэміі па турысцка-прыкладным мнагаборстве добра падрыхтаваная. Мы трэніруемся два разы на тыдзень, а перад спаборніцтвамі арганізоўваюцца зборы. Таму зусім простыя заданні нам былі б нецікавыя. Кожны прыязджае сюды, каб выпрабаваць сябе, зразумець, на што здольны ты сам і твая каманда".

Другая частка спаборніцтваў конкурсная. І першы ж конкурс — прад-



тэрыторыі навучальнай установы, якую прадстаўляюць студэнты. Таму патрабаванні да арганізацыі лагераў вельмі высокія. Суддзейская калегія звяртае ўвагу на правільнасць усталявання палатак, распальвання вогнішчаў, захоўвання прадуктаў, сочыць за выкананнем супрацьпажарных і прыродаахоўных правіл. Усім камандам удаецца адпавядаць гэтым строгім патраба-



ваннем. Галоўная суддзя спаборніцтваў Лідзія Андрэеўна Жур расказвае, што вызначыць каманду, лепшую ў арганізацыі быту, вельмі складана, таму што студэнты падрымліваюць безда-



нага тэхнічнага ўніверсітэта сама напісала песню спецыяльна для рэспубліканскага злёту. Перамогу ў гэтым конкурсе святкавалі хлопцы і дзяўчаты з каманды Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, таксама яны стварылі і лепшую газету для конкурсу.

У вольны час удзельнікам злёту не давялося сумаваць: валейбольная і футбольная пляцоўкі не заставаліся пустымі, былі арганізаваны гульні, конкурсы, культурна-забаўляльная праграма, дыскатэка. А пакуль студэнты-турысты адпачывалі пасля конкурсных выпрабаванняў, суддзейская каманда падвяла вынікі турзлёту. У агульным заліку перамагла каманда Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, на другім месцы студэнты з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, на трэцім месцы каманда Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

Радаваліся пераможцы, але не сумавалі і тыя, хто дыпломаў не атрымаў, бо кожны турыст адпраўляецца ў паход перш за ўсё за ўражаннямі і атмасферай. "Такую атмасферу, як ля паходнага кастра, не знойдзеш больш нідзе, — кажа Ірына Міхайлаўна Мурзёнак, старшы выкладчык Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і заўзяты турыст. — Захопленасць турызмам — гэта на ўсё жыццё!" І ўсе ўдзельнікі злёту ўжо зараз плануюць наступныя паходы, бо кожны турыст ведае, што ежа, прыгатаваная на паходным кастры, самая смачная, песні пад гітару самыя прыгожыя, а сябры, якіх знайшоў у паходзе, самыя надзейныя.

**Дар'я РЭВА.**
*minskaya@ng-press.by*
**Фота аўтара.**